# БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА, КНІГАЗНАЎСТВА, БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА

УДК 021.2+021.4

*Н. У. КЛІМЯНКОВА*

## ПЕДАГАГІЧНЫЯ ЎМОВЫ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ КАРЫСТАЛЬНІКАМ БІБЛІЯТЭК АДКРЫТАГА ДОСТУПУ ДА ІНФАРМАЦЫІ І КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

*У артыкуле вызначаюцца педагагічныя ўмовы забеспячэння карыстальнікам бібліятэк адкрытага доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей. Разглядаецца спецыфіка бібліятэкі як педагагічнай сістэмы. Прыводзяцца абгрунтаванне і класіфікацыя педагагічных умоў, ад якіх залежыць паспяховасць і эфектыўнасць яе функцыянавання: арганізацыйна-педагагічных, псіхолага-педагагічных і дыдактычных. Паказана, як разнастайныя ўмовы стасуюцца з асобнымі элементамі цэласнай сістэмы «бібліятэка».*

Забеспячэнне карыстальнікам адкрытага і бесперашкоднага доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей непасрэдна звязана з праблемамі функцыянавання бібліятэкі як педагагічнай сістэмы. Тэарэтычнае асэнсаванне неабходнасці разглядаць бібліятэку менавіта як педагагічную сістэму грунтоўна прадстаўлена ў савецкім, а потым расійскім і айчынным бібліятэказнаўстве [1; 2; 4; 6; 11–15]. Аднак сацыяльна-палітычныя пераўтварэнні ў грамадстве, інфарматызацыя ўсіх бакоў жыцця, укараненне ў бібліятэчную практыку інфармацыйных тэхналогій унеслі істотныя змены ў разуменне педагагічнай прыроды бібліятэкі і ўмоў існавання яе як педагагічнай сістэмы.

У якасці новых аспектаў методыкі бібліятэчнай справы былі прапанаваны: асветніцкі, сацыялізуючы, маркетынгавы, інфармацыйны і іншыя падыходы. Яны не толькі не выключаюць педагагічную накіраванасць бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, але надаюць ёй новы сэнс і змест. Ствараючы інфармацыйнае асяроддзе, забяспечваючы доступ да сусветных інфармацыйных рэсурсаў карыстальнікам, бібліятэка не можа пакінуць іх сам на сам з праблемамі пошуку, адбору і засваення інфармацыі, пераўтварэння яе ў веды. Яна павінна актыўна спрыяць фарміраванню інфармацыйнай культуры, што з’яўляецца педагагічнай задачай. Зараз ужо зусім недастаткова зрабіць інфармацыю ва ўсіх яе відах, формах, на ўсіх магчымых носьбітах фізічна даступнай карыстальніку. Неабходна аказ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваць яму ўсебаковую дапамогу ў яе ўспрыманні, асэнсаванні і засваенні, а гэта ўжо шэраг педагагічных задач.

Калі разглядаць бібліятэку як педагагічную сістэму, ключавымі аспектамі, што патрабуюць пільнай увагі, з'яўляюцца вызначэнне, абгрунтаванне і праверка педагагічных умоў, ад якіх залежыць паспяховасць і эфектыўнасць функцыянавання такой сістэмы. Педагагічныя ўмовы выступаюць у якасці ключавога кампанента, што адлюстроўвае сукупнасць магчымасцей яе знешняга і ўнутранага асяроддзя па аказанні істотнага ўплыву на асобасны і працэсуальны аспекты бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, забеспячэння яе эфектыўнага ажыццяўлення і ўдасканалення. Удасканаленне функцыянавання бібліятэкі як педагагічнай сістэмы магчыма толькі пры сістэмным падыходзе да пераўтварэння яе элементаў. Несістэмны, лакальны падыход у дадзеным выпадку бесперспектыўны.

Разам з тым у сучасным бібліятэказнаўстве да гэтага часу не склалася сістэмнага ўяўлення аб сукупнасці ўмоў забеспячэння карыстальнікам свабоднага доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей, не вызначаны роля і месца псіхолага-педагагічных умоў, не паказана, як разнастайныя ўмовы стасуюцца з асобнымі элементамі цэласнай сістэмы «бібліятэка», уплываючы на яе функцыянаванне.

У мэтах вызначэння і абгрунтавання педагагічных умоў забеспячэння карыстальнікам свабоднага і бесперашкоднага доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей, на наш погляд, неабходна:

– ажыццявіць аналіз і канкрэтызацыю паняццяў «умовы» і «педагагічныя ўмовы» з пункту гледжання бібліятэчнай педагогікі;

– удакладніць класіфікацыю груп педагагічных умоў у адпаведнасці з арыентацыяй на характар і прыроду вырашаемых бібліятэчна-педагагічных задач;

– даць характарыстыку псіхолага-педагагічным умовам у адпаведнасці з іх месцам сярод іншых умоў функцыянавання бібліятэкі як сацыяльнага інстытута і педагагічнай сістэмы.

У педагагічнай навуцы ўмовам функцыянавання і развіцця педагагічных сістэм прысвечана шмат публікацый. У розных аспектах аналізуецца паняцце «ўмовы» з пункту гледжання філасофіі, педагогікі і псіхалогіі [5; 8; 10; 16], ажыццяўляецца групоўка педагагічных умоў па розных прыкметах: сфера ўздзеяння (знешнія і ўнутраныя), характар уздзеяння (суб'ектыўныя і аб'ектыўныя), спецыфіка аб'екта ўздзеяння (агульныя і спецыфічныя) і г.д.

Педагагічныя ўмовы выступаюць у якасці ключавой катэгорыі пры распрацоўцы методык і механізмаў узаемадзеяння педагога з навучэнцам. Так, у ходзе аналізу абароненых у апошнія гады кандыдацкіх дысертацый Б. В. Купрыянаў [8] выдзяляе некалькі ўзроўняў педагагічных умоў.

У выніку комплекснага аналізу паняцця «педагагічныя ўмовы», яго сутнасці і класіфікацыі ў педагагічных даследаваннях Н. Іпалітавай і Н. Сцерхавай прыйшлі да высновы, што паняцце «ўмова» з'яўляецца агульнанавуковым і ўяўляе сукупнасць прычын, абставін і з'яў, уплываючых на функцыянаванне і развіццё таго ці іншага аб'екта (у тым ліку і педагагічнай сістэмы) [5].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На думку сучасных даследчыкаў, педагагічныя ўмовы выступаюць неад'емным кампанентам педагагічнай сістэмы і адлюстроўваюць яе наяўныя магчымасці ўздзейнічаць на асобасны і працэсуальны аспекты педагагічнага працэсу, забяспечваць яго эфектыўнае здзяйсненне і ўдасканаленне.

Выдзяляючы розныя віды педагагічных умоў, педагогі найбольш часта называюць арганізацыйна-педагагічныя, псіхолага-педагагічныя і дыдактычныя ўмовы. Арганізацыйна-педагагічныя ўмовы ляжаць у аснове кіравання функцыянаваннем і развіццём працэсуальнага аспекту педагагічнай сістэмы. Псіхолага-педагагічныя ўмовы, у сваю чаргу, накіраваны на развіццё асобаснага аспекту педагагічнай сістэмы (пераўтварэнне канкрэтных характарыстык асобы). Дыдактычныя ўмовы выступаюць як вынік мэтанакіраванага адбору, канструявання і ўжывання элементаў зместу, метадаў (прыёмаў), а таксама арганізацыйных форм навучання для дасягнення пастаўленых мэт [5].

Абапіраючыся на канцэпцыі сучаснай педагогікі, бібліятэказнаўцам мэтазгодна ажыццявіць класіфікацыю і групоўку педагагічных умоў у адпаведнасці з характарам і спецыфікай педагагічных праблем, уласцівых менавіта бібліятэцы як педагагічнай сістэме, праблем, вырашэнню якіх і спрыяюць адпаведныя ўмовы. Распрацоўка дадзеных пытанняў ажыццяўляецца ў межах бібліятэчнай педагогікі.

Сутнасць, прадмет, задачы, прынцыпы і катэгорыі бібліятэчнай педагогікі мы разглядалі ў сваіх папярэдніх публікацыях [6]. Гісторыю станаўлення бібліятэчнай педагогікі, змест і характар педагагічнай падрыхтоўкі бібліятэчнага работніка шматбакова адлюстравала ў сваіх работах Н. У. Збароўская [4]. Псіхолага-педагагічныя асновы педагогікі дзіцячага чытання грунтоўна распрацавала І. І. Ціхамірава [14]. Аднак праблема вызначэння і навуковага абгрунтавання педагагічных умоў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці дагэтуль яшчэ не распрацавана. Вось чаму неабходна звярнуцца да вызначэння і аналізу педагагічных умоў забеспячэння свабоднага доступу карыстальнікам бібліятэк да інфармацыі і культурных каштоўнасцей як асноўнай мэты бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання.

На першы погляд дадзеная праблема звязана выключна з абслугоўваннем карыстальнікаў бібліятэк. Але, калі разумець бібліятэку як сістэму, тым больш педагагічную, неабходна разам з вызначэннем педагагічных умоў удасканалення абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк не пакідаць без увагі і ўмовы развіцця такіх элементаў сістэмы, як бібліятэчны фонд, альбо інфармацыйныя рэсурсы і матэрыяльна-тэхнічная база бібліятэкі, таму што без гэтых элементаў і само абслугоўванне немагчыма.

Абапіраючыся на класіфікацыю ўмоў бесперашкоднага і эфектыўнага функцыянавання педагагічных сістэм і ажыццяўлення педагагічных працэсаў, паспрабуем выявіць спецыфіку арганізацыйна-педагагічных, псіхолага-педагагічных і дыдактычных умоў забеспячэння карыстальнікам бібліятэк свабоднага доступу да інфармацыі і ведаў у сучаснай бібліятэцы.

Арганізацыйна-педагагічныя ўмовы ўяўляюць, з аднаго боку, сукупнасць аб'ектыўных магчымасцей, неабходных для вырашэння педагагічных задач [7], а з другога – сукупнасць форм і метадаў, сродкаў і рэсурсаў,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія спрыяюць дасягненню педагагічных мэт [3]. Не менш значным кампанентам выступаюць таксама і аспекты, звязаныя з кіраваннем як асобнымі педагагічнымі працэсамі, так і цалкам педагагічнай сістэмай [9].

Неабходнай умовай забеспячэння доступу да інфармацыі і ведаў уяўляецца існаванне бібліятэкі як сацыяльнага інстытута і педагагічнай сістэмы. Выкананне ёй сацыяльных функцый па зборы, захаванні і прадастаўленні карыстальнікам інфармацыі ставарае магчымасці педагагічнага ўплыву на чытацкую аўдыторыю і асобных чытачоў. Прычым педагагічны ўплыў на чытача і чытацкую аўдыторыю ажыццяўляецца праз належным чынам арганізаваную сістэму абслугоўвання карыстальнікаў. Ключавой умовай функцыянавання дадзенай сістэмы выступаюць інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі. Матэрыяльна-тэхнічная база бібліятэкі, асабліва з пункту гледжання сучасных аўтаматызаваных сродкаў прадастаўлення карыстальнікам доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей, таксама павінна спрыяць вырашэнню педагагічных задач. Але без належнага кіравання ні сама бібліятэка як сістэма, ні педагагічныя працэсы ў ёй існаваць не могуць. Такім чынам, пад арганізацыйна-педагагічнымі ўмовамі мы будзем разумець:

– наяўнасць бібліятэкі як сацыяльнага інстытута і педагагічнай сістэмы;

– наяўнасць сувязей і ўзаемадзеяння з іншымі сацыяльнымі інстытутамі і педагагічнымі сістэмамі;

– належным чынам сфарміраваныя і падрыхтаваныя для выкарыстання інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі;

– доступ да інфармацыйных рэсурсаў сусветнай інфармацыйнай прасторы;

– сістэму абслугоўвання, структура якой адпавядае мэтам і задачам бібліятэкі, патрабаванням яе карыстальнікаў;

– матэрыяльна-тэхнічную базу, якая адпавядае статусу бібліятэкі і ступені складанасці вырашаемых ёй задач;

– сістэму кіравання бібліятэкай і бібліятэчна-інфармацыйнымі працэсамі.

Псіхолага-педагагічныя ўмовы забеспячэння доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей адлюстроўваюць асобасны аспект бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Улічваючы спецыфічныя характарыстыкі бібліятэкі як педагагічнай сістэмы, яны могуць выглядаць наступным чынам:

– вывучэнне карыстальніка бібліятэкі – яго абставін, чытацкіх і псіхалагічных характарыстык;

– падрыхтоўка бібліятэкара як суб'екта педагагічнай дзейнасці – фарміраванне здольнасцей мэтанакіравана і адрасна выкарыстоўваць інфармацыйны патэнцыял бібліятэкі;

– аптымізацыя чытацкай дзейнасці карыстальніка; узвышэнне адносін карыстальніка да ўласнай чытацкай дзейнасці;

– педагагічнае ўздзеянне бібліятэкара, накіраванае на забеспячэнне свабоднага доступу да інфармацыі і ведаў;

– мэтанакіраваны ўплыў на змест і характар унутранага асяроддзя бібліятэкі;

– улік асаблівасцей знешняга асяроддзя і ўзаемадзеянне з ім.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучэнне сацыяльных, псіхалагічных і чытацкіх характарыстык карыстальнікаў бібліятэк як умова павышэння эфектыўнасці не толькі абслугоўвання, але і іншых кірункаў дзейнасці бібліятэкі – адна з асноўных яе задач. Цэласнае і аб'ектыўнае ўяўленне аб карыстальніку, яго патрэбнасцях, матывах, мэтах звароту да інфармацыі дазваляе актыўна спрыяць развіццю чытацкай дзейнасці, фарміраванню чытацкай і інфармацыйнай культуры.

Не менш значнай уяўляецца камунікатыўная і прафесійная кампетэнтнасць бібліятэкара як умова плённага псіхолага-педагагічнага ўзаемадзеяння з карыстальнікам. Педагагічная дзейнасць бібліятэкара будуецца на падставе педагогікі супрацоўніцтва, раўнапраўных суб'ект-суб'ектных адносін і, у рэшце рэшт, забяспечвае свабодны доступ да інфармацыі і культурных каштоўнасцей усім групам карыстальнікаў.

Роля ўнутранага і знешняга асяроддзя бібліятэкі ў рэалізацыі псіхолага-педагагічных задач абслугоўвання карыстальнікаў з мэтай забеспячэння доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей заключаецца ва ўзмацненні псіхолага-педагагічнага ўплыву на змест і характар узаемадзеяння паміж бібліятэкай і карыстальнікам.

Унутранае асяроддзе бібліятэчнай установы ў значнай ступені ўплывае на эфектыўнасць бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Стварэнне псіхалагічна камфортнага, інфармацыйна і метадычна насычанага бібліятэчнага асяроддзя – адна з ключавых псіхолага-педагагічных умоў забеспячэння свабоднага доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей.

Асабліва важна камфортнае і змястоўнае бібліятэчнае асяроддзе для сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў: людзей сталага ўзросту, дзяцей, падлеткаў, юнакоў, чытачоў з абмежаванымі псіхафізіялагічнымі магчымасцямі. Менавіта яны найбольш востра адчуваюць патрэбу ў псіхолага-педагагічнай падтрымцы і дапамозе пры пошуку і засваенні інфармацыі.

У структуры ўнутранага бібліятэчнага асяроддзя можна выдзеліць матэрыяльна-тэхнічныя, эмацыянальна-эстэтычныя, інфармацыйна-метадычныя і сацыяльна-псіхалагічныя кампаненты, якія ствараюць непаўторную атмасферу бібліятэкі, здольную прыцягнуць да чытання малачытаючых карыстальнікаў і забяспечыць камфортны і бесперашкодны доступ да кнігі, чытання, інфармацыі тым, хто ўсведамляе іх каштоўнасць і неабходнасць.

Знешняе асяроддзе і ўзаемадзеянне з ім у значнай ступені задаюць мэты і задачы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Карыстальнік, які звяртаецца ў бібліятэку, з'яўляецца паўнамоцным прадстаўніком знешняга асяроддзя, бо менавіта там адбываецца яго асноўная дзейнасць і ўзнікаюць праблемы, што патрабуюць новай інфармацыі і ведаў. Ён выступае не толькі ў пасіўнай ролі спажыўца, але і ў якасці транслятара патрабаванняў, прад'яўляемых знешнім асяроддзем да зместу і характару інфармацыі, спосабаў прадастаўлення доступу да яе. Таксама карыстальнік выступае ў якасці эксперта выніковасці намаганняў бібліятэкі па прадастаўленні адкрытага і бесперашкоднага доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя праблем, вырашаемых з дапамогай інфармацыі і ведаў, знешняе асяроддзе пастаўляе і партнёраў, якія садзейнічаюць больш дасканаламу і аператыўнаму забеспячэнню доступу. Гэта ўстановы адукацыі, сістэма кнігавыдання і распаўсюджання інфармацыі, сродкі масавай камунікацыі, сацыяльныя службы, камерцыйныя структуры, грамадскія арганізацыі і г.д.

Пад дыдактычнымі ўмовамі мы будзем разумець сукупнасць форм, метадаў, прыёмаў, накіраваных на забеспячэнне плённай чытацкай дзейнасці па пошуку, выбары і засваенні інфармацыі, пераўтварэнні яе ў веды.

Асноўнымі прыярытэтнымі кірункамі бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, патрабуючымі спецыфічных дыдактычных умоў, з’яўляюцца: фарміраванне прававой культуры карыстальнікаў, дапамога ў бесперапыннай адукацыі і самаадукацыі, дапамога сацыяльна неабароненым карыстальнікам, фарміраванне культуры чытання і інфармацыйнай культуры.

Метадычнае забеспячэнне развіцця і ўдасканалення кожнага з гэтых кірункаў патрабуе рэалізацыі спецыфічных псіхолага-педагагічных падыходаў, знаходжання і творчага выкарыстання эфектыўных механізмаў узаемадзеяння з карыстальнікам, якія забяспечваюць станоўчы ўплыў на змест і характар яго чытацкай дзейнасці. Адным з такіх механізмаў выступаюць бібліятэчныя зносіны. Не менш важнымі падаюцца прынцыпы педагогікі супрацоўніцтва, а таксама прыёмы з арсенала педагогікі дарослых.

Спецыфічна бібліятэчнымі формамі стварэння і рэалізацыі дыдактычных умоў забеспячэння доступу да інфармацыі з’яўляюцца: кніжная выстаўка, бібліятэчны дыялог, кансультацыя, гутарка, агляд літаратуры, праграмы і планы чытання, усе віды даведак, урокі і школы інфармацыйнай культуры, чытацкія аб’яднанні і клубы па інтарэсах, групавыя і масавыя мерапрыемствы і г.д. У працэсе падрыхтоўкі і правядзення кожнай з адзначаных форм узаемадзеяння з карыстальнікам бібліятэкар ставіць шэраг педагагічных задач, вырашэнне якіх знаходзіцца ў непасрэднай залежнасці ад наступных дыдактычных умоў:

– псіхолага-педагагічнае майстэрства бібліятэкара;
– адпаведнасць зместу інфармацыі інтарэсам карыстальнікаў;
– сэнсавая даступнасць інфармацыі;
– нагляднасць;
– наяўнасць інтэрактыўных элементаў;
– актыўнасць і зацікаўленасць саміх карыстальнікаў.

Пры выяўленні і рэалізацыі арганізацыйна-педагагічных, псіхолага-педагагічных і дыдактычных умоў забеспячэння карыстальнікам бібліятэк свабоднага доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей мэтазгодна, на наш погляд, абапірацца на сістэмна-дзейнасны і асобасна-дзейнасны падыходы. Важна таксама ўлічваць унутраныя асаблівасці бібліятэкі і спецыфіку псіхолага-педагагічных працэсаў, што адбываюцца пры абслугоўванні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэка як педагагічная сістэма ўяўляе цэласнае адзінства ўсіх фактараў, якія садзейнічаюць дасягненню пастаўленых мэт чытацкага развіцця карыстальніка праз прадастаўленне яму свабоднага доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей і адпаведнай псіхолага-педагагічнай падтрымкі ў працэсе абслугоўвання.

Бібліятэкар і карыстальнік выступаюць у якасці суб'ектаў абслугоўвання. У чатырохэлементнай сістэме «бібліятэка» «кантынгент карыстальнікаў» і «бібліятэчны персанал» з'яўляюцца вядучымі элементамі. Інфармацыйныя рэсурсы – гэта аб'ект, на які накіравана ўвага суб'ектаў абслугоўвання. У сістэме «бібліятэка» інфармацыйныя рэсурсы – асноўны, сістэмаўтвараючы элемент. Задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў як прадмет псіхолага-педагагічнага ўзаемадзеяння суб'ектаў абслугоўвання зараз немагчыма нават уявіць без сучасных сродкаў аўтаматызацыі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, інфармацыйных тэхналогій і іншых кампанентаў матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэкі.

Такім чынам, усе элементы сістэмы «бібліятэка» арганічна ўключаны ў педагагічны працэс, а арганізацыйна-педагагічныя, псіхолага-педагагічныя і дыдактычныя ўмовы, неабходныя для рэалізацыі патэнцыялу кожнага з пазначаных элементаў, адыгрываюць значную ролю ў забеспячэнні свабоднага доступу карыстальнікам да інфармацыі і культурных каштоўнасцей.

Выяўленне ўмоў, якія забяспечваюць функцыянаванне і развіццё бібліятэкі як педагагічнай сістэмы, цэласнага бібліятэчна-педагагічнага працэсу, з'яўляецца адной з важных задач сучаснага бібліятэчна-педагагічнага даследавання. Яе паспяховае вырашэнне складае навуковую навізну і абумоўлівае практычную каштоўнасць атрыманых вынікаў, абгрунтаванасць прапануемых метадычных распрацовак.


1. *Айзенберг, А. Я.* Образовательная функция библиотеки / А. Я. Айзенберг // Развитие педагогических функций советских библиотек : межвуз. сб. науч. тр. / отв. ред. В. И. Терешин. – М. : МГИК, 1991. – С. 43–51.

2. *Айзенберг, А. Я.* О педагогической функции библиотекаря в условиях компьютеризации библиотечного обслуживания читателей / А. Я. Айзенберг // Библиотека в контексте истории : тез. докл. – М. : МГУК, 1998. – С. 61.

3. *Беликов, В. А.* Философия образования личности: деятельностный аспект / В. А. Беликов. – М. : Владос, 2004. – 357 с.

4. *Збаровская, Н. В.* Библиотечная педагогика как научная дисциплина / Н. В. Збаровская // Библиотековедение. – 2006. – № 2. – С. 118–125.

5. *Ипполитова, Н.* Анализ понятия «педагогические условия»: сущность, классификация / Н. Ипполитова, Н. Стерхова // General and Professional Education. – 2012. – № 1. – P. 8–14.

6. *Клімянкова, Н. У.* Бібліятэчная педагогіка ў грамадстве ведаў: тэарэтыка-метадычны аспект / Н. У. Клімянкова // Искусство и культура. – 2012. – № 2 (6). – С. 101–106.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Козырева, Е. И.* Школа педагога-исследователя как условие развития педагогической культуры / Е. И. Козырева // Методология и методика естественных наук : сб. науч. тр. – Омск : Изд-во ОмГПУ, 1999. – Вып. 4. – С. 4–9.

8. *Куприянов, Б. В.* Гипотеза кандидатской диссертации (о многообразии педагогических условий) / Б. В. Куприянов // Наука и практика воспитания и дополнительного образования. – 2006. – № 4. – С. 100–108.

9. *Павлов, С. Н.* Организационно-педагогические условия формирования общественного мнения органами местного самоуправления : автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / С. Н. Павлов ; Магнитогорский гос. пед. ин-т. – Магнитогорск, 1999. – 23 с.

10. Педагогика / под ред. Ю. К. Бабанского. – М. : Педагогика, 1988. – 432 с.

11. Развитие педагогических функций советских библиотек : межвуз. сб. науч. тр. / отв. ред. В. И. Терешин. – М. : МГИК, 1991. – 326 с.

12. *Савич, Л. Е.* О библиотечной педагогике здоровья / Л. Е. Савич // Библиотековедение. – 2011. – № 3. – С. 28–33.

13. *Терешин, В. И.* Библиотека – педагогическая система / В. И. Терешин // Библиотековедение. – 1998. – № 5. – С. 33–46.

14. *Тихомирова, И. И.* Библиотечная педагогика, или Воспитание книгой : учеб.-метод. пособие для библиотекарей, работающих с детьми / И. И. Тихомирова. – СПб. : Профессия, 2011. – 384 с.

15. *Тихомирова, И. И.* Условия и предпосылки терапевтического эффекта чтения / И. И. Тихомирова // Библиопсихология и библиотерапия. – М. : Шк. б-ка, 2005. – С. 219–226.

16. Философский энциклопедический словарь / сост.: Е. Ф. Губский, Г. В. Кораблева, В. А. Лутченко. – М. : Инфра-М, 2000. – С. 98.

*N. KLIMENKOVA*

## PEDAGOGICAL CONDITIONS FOR PROVIDING A FREE ACCESS TO INFORMATION AND CULTURAL VALUES TO THE LIBRARIES' USERS

*The pedagogical conditions for providing a free access to information and cultural values to the libraries' users are defined in the article. The specificity of a library as a pedagogical system is considered. The justification and classification of pedagogical conditions (organizational and pedagogical, psychological and pedagogical, and didactic) on which the success and the effectiveness of its functioning depend are given. The interaction of various conditions with separate elements of a complete library system is analyzed.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 22.03.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ